А.Дз. Цеплякова (Магілё

СТРУКТУРА, СЕМАНТЫКА І ФУНКЦЫІ ЗАПАЗЫЧАНЫХ КРЫЛАТЫХ СЛОЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Крылатыя выразы ў сучаснай беларускай літаратурнай мо складаюць вялікі пласт адзінак як уласна беларускага паходжання, так запазычаных з іншых моў: старажытных грэчаскай ці лацінскай, сучасны рускай, нямецкай, англійскай, французскай і інш. [1; 2]. Запазычан крылатых слоў з іншых моў – неад'емная і значная частка агульна развіцця крылатыкі ў кожнай літаратурнай мове. Крылатыя словы ў кожна мове – гэта неаднародны аб'ект, які складаецца са шматлікіх адзіна разнастайных не толькі па сваім генезісе, але і на крыніцах паходжанн граматычнай структуры, семантыцы, спосабах функцыяніравання і г.д.

Крылатыя словы ад іншых фразеалагічных сродкаў мовы адрозніва адсутнасць "сваіх" спецыфічных структур. У самым агульным выгляд крылатыя словы могуць быць дыферэнцыраваны на наступныя структурны тыпы:

1. Мінітэкст (цытата большая па аб'ёму, чым адзін сказ), напр *<Каня! Каня!> Паўцарства за каня!* ← англ. *A horse! a horse! my kingdo for a horse!* (У. Шэкспір, "Кароль Рычард III" (1593); *Спыніся імгненне! Т цудоўнае!* ← ням. *Verweile doch! Du bist so schön!* (І.В. Гётэ, "Фауст" (1808 *Кароль памёр! Няхай жыве кароль!* ← фр. *Le roi est mort! Vive le ro* (выслоўе з афіцыйна зацверджанага рытуалу каралеўскага дому ў Франц

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(да пачатку XIX ст.), якое выкарыстоўвалася пры абвяшчэнні змены каралёў у сувязі са смерцю аднаго і пачаткам праўлення іншага).

2. Закончаны сказ (просты ці складаны), напр.: *<О> святая прастата (наіўнасць)!* ← лац. *O sancta simplicitas!* (выраз з гістарычнага анекдота пра ідэолага чэшскай Рэфармацыі Яна Гуса (1371-1415), у якім распавядаецца, што гэтыя словы ён вымавіў, калі, асуджаны інквізіцыяй у Канстанцы на смерць, знаходзячыся на вогнішчы, убачыў, як нейкая бабулька (па іншай версіі – стары) ў прастадушным рэлігійным памкненні прынесла ахапак вецця і кінула яго ў вогнішча); *Апетыт прыходзіць у часе яды* ← фр. *L'appétit vient en mangeant* (Ф. Рабле, "Гарганцюа і Пантагруэль" (1532); *Праўду, <толькі праўду> і нічога, акрамя праўды!* ← англ. *The truth, the whole truth and nothing but the truth!* (Дж. Лілі, "Эўфуес і яго Англія" (1580); *Вайна – гэта працяг палітыкі іншымі сродкамі* ← ням. *Der Krieg ist die Fortsetzung der Politik mit anderen Mitteln* (К. Клаўзевіц, "Аб вайне" (1834); *Яны не пройдуць!* ← існ. *No pasarán!* (выслоўе іспанскага палітычнага дзеяча Д. Ібаруры (1895-1989) з прамовы па радыё 19 чэрвеня 1936 г., лозунг рэспубліканскай арміі пры абароне Мадрыда ў гады грамадзянскай вайны ў Іспаніі (1936-1939).

3. Словазлучэнні розных відаў, напр.: *свет цесны* ← іт. *il mondo po* (выраз прыпісваецца Х. Калумбу, які ў 1492 г. адправіўся на трох іспанскіх караблях шукаць прамы марскі шлях у Індыю, але нечакана трапіў да берагоў невядомай тады Амерыкі, "адкрыў Амерыку"); *рыцар плашча і шпагі* ← існ. *comedia de capa y espada* (назва жанра іспанскай камедыі XVII ст., героямі якой былі вясёлыя і задзірлівыя кавалеры); *дух часу* ← ням. *Geist der Zeit* (І.В. Гётэ, "Фауст" (1808); *цягаць з агню каштаны* ← фр. *tirer les marrons du feu* (Ж. дэ Лафантэн, "Малпа і кот"); *<трое> ў адной лодцы* ← англ. *three men in a boat* (Дж.К. Джэром, "Трое ў лодцы, калі не лічыць сабаку" (1889).

4. Граматычна не структураваныя спалучэнні слоў, напр.: бел. *гог і магог* ← англ. *Gog and Magog* (Апакаліпсіс, 20; Іезікііл, 38, 39); *плоць і кроў* ← ням. *Fleisch und Blut* (са Св. Пісання); *між (паміж) Сцылай і Харыбдай* ← ням. *zwischen Szylla und Chary bdis* ці англ. *between Scylla and Charybdis* (з грэчаскай міфалогіі); *усё або нічога* ← англ. *all or nothing* (Г. Ібсэн, "Бранд" (1866); *рукі прэч* ад каго, ад чаго ← англ. *hands off* (выраз англійскага палітычнага дзеяча, лідэра ліберальнай партыі У. Гладстана; у 1878 г., калі Аўстрыя захапіла частку сербскіх зямель, Гладстан выступіў у парламенце супраць захопніцкай палітыкі і закончыў: "Рукі прэч ад Босніі і Герцагавіны").

5. Асобныя словы, напр.: *утопія* ← лац. *utopia* (Т. Мор, "Залатая кніга, настолькі ж карысная, як і забаўная, пра найлепшы дзяржаўны лад і пра новы востраў Утопія" (1516); *звышчалавек* ← ням. *Übermensch* (Ф. Ніцшэ, "Так казаў Заратустра" (1883-1891).

Па сваёй семантыцы крылатыя словы ў сучаснай беларускай мове дыферэнцыруюцца на адзінкі, якія маюць рознае значэнне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1. Прамое значэнне, напр.: *Адзін за ўсіх <і> ўсе за аднаго* або *Усе за аднаго і адзін за ўсіх* ← фр. *Tous pour un, un pour tous* (А. Дзюма-бацька, "Тры мушкецёры" (1844) ці англ. *One for all, all for one* (У. Шэкспір, "Лукрэцыя" (1594), першапачаткова ўжывалася як прыказка, вядомая ў многіх еўрапейскіх мовах; *правы чалавека <і грамадзяніна>* ← фр. *les droits de homme et de citoyen* (з "Дэкларацыі праў чалавека і грамадзяніна" (прынятай 26 жніўня 1789 г.) палітычнага маніфеста буржуазнай рэвалюцыі ў Францыі (1789-1794), аўтарам якога з'яўляецца французскі святар і палітычны дзеяч Эманюэль Жазэф Сьейес (1748-1836).

2. Пераасэнсаваныя асобныя кампаненты, напр.: *жоўтая прэса* (дзе *жоўты* мае пераноснае значэнне) ← англ. *yellow press* (выслоўе амерыканскага журналіста Э. Уордмэна, рэдактара часопіса "New York Press", які ў 1896 г. так назваў газеты "The World" і "New York Journal" з прычыны гучнай, скандальнай спрэчкі паміж імі за права аўтарскага першынства на выяву дзіцяці ў жоўтай кашульцы, што выкарыстоўвалася абодвума выданнямі ў фрывольных малюнках з гумарыстычнымі тэкстамі); *Мой дом – мая крэпасць* (дзе *крэпасць* мае пераноснае значэнне) ← англ. *My house is my castle* (Э. Кок, "Трэці інстытут законаў Англіі" (1628).

3. Пераноснае значэнне, напр.: *скакаць пад дудку* чыю-н. ('пакарацца каму-н., выконваць яго волю') ← ням. *nach j-s Pfeife tanzen* (Эзоп, "Рыбак і рыбы"); *Апетыт прыходзіць у часе яды* ('патрэбнасць, зацікаўленасць у чым-н., жаданне чаго-н. звычайна чым больш задавальняюцца, тым больш і павялічваюцца') ← фр. *L'appétit vient en mangeant* (Ф. Рабле, "Гарганцюа і Пантагруэль" (1532); *трымаць порах сухім* ('быць пільным, быць у баявой гатоўнасці') ← англ. *keep one's powder dry* (прыпісваецца О. Кромвелю (1599-1658) – кіраўніку англійскай буржуазнай рэвалюцыі XVII ст.; калі яго войска павінна было фарсіраваць раку, ён нібыта сказаў: "Спадзявайцеся на Бога, але порах трымайце сухім"); *рыцар журботнага вобраза* ('Дон Кіхот; хто-н. падобны сваімі паводзінамі, знешнім выглядам на Дон Кіхота; усякі бескарысны абаронца справядлівасці, наіўны, бясплённы летуценнік') ← ісп. *el Caballero de la Triste Figura* (С.М. дэ Сервантэс, "Дон Кіхот" (1605-1615); *брыдкае качаня* ('той, чые асабістыя вартасці (прыгажосць, талент і г.д.) да пэўнага часу не заўважаліся, але раптам выявіліся ў поўнай меры') ← дац. *"Den Grimme Ælling"* (назва казкі (1842) дацкага пісьменніка Г.Х. Андэрсена (1805-1875).

4. Прамое і пераноснае значэнне, напр.: *невядомы салдат* (1. 'Воін, загінуўшы на вайне, імя і абставіны смерці якога засталіся невядомымі'; 2. *перан. іран.* 'Усякі, хто бескарысна змагаецца за што-н.' ← фр. *soldat inconnu* (выраз з эпітафіі на надмагіллі астанкаў невядомага салдата – ахвяры першай сусветнай вайны, якія былі пахаваныя 11 лістапада 1920 г. пад Трыумфальнай аркай у Парыжы, а пазней у Вестміністэрскім абацтве ў Лондане; пасля другой сусветнай вайны тое ж было зроблена ў іншых краінах (помнікі невядомаму салдату ёсць і ў Беларусі).

5. Страчаную ўнутраную форму, напр.: *<жыць> на шырокую нагу* ← англ. *<live> on a large scale* ці ням. *auf großem Fuß <leben>* (выраз з

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гістарычнага анекдота, у якім распавядаецца, што сярэдневяковая мода насіць абутак з доўгімі, вострымі, загнутымі дагары наскамі, памеры якіх сімвалізавалі ступень знатнасці яго ўладальніка і вызначаліся спецыяльным законам, сваім узнікненнем абавязана англійскаму каралю Генрыху II Плантагенету (1133-1189), які насіў такі абутак, паколькі меў нараст на вялікім пальцы правай нагі).

У беларускай мове крылатыя словы ўжываюцца ў некалькіх функцыях.

1. У функцыі намінатыўных адзінак: для абазначэння з'яў, сітуацый, тыпаў, адносін і да т.п., напр.: *пракрустава ложа* ← фр. *lit de Procruste* (з грэчаскай міфалогіі); *залатая сярэдзіна* ← лац. *aurea mediocritas* (Гарацый, "Оды"); *жанчына бальзакаўскага ўзросту* ← фр. *"La femme de trente ans"* (назва рамана (1831) французскага пісьменніка А. дэ Бальзака (1799-1850); *згубленае (страчанае) пакаленне* ← англ. *the lost generation* (словы амерыканскай пісьменніцы Г. Стайн, выкарыстаныя як эпіграф да рамана Э. Хемінгуэя "І ўзыходзе сонца" (1926).

2. У якасці аргумента на карысць думкі, якую выказвае аўтар у адносінах да каго- ці чаго-небудзь, ці ў якасці фармулёўкі ў большай ці меншай ступені распаўсюджанага погляду, напр.: *Скажы <мне>, хто твае сябры (твой сябра), <і> я скажу, хто ты* або *Скажы <мне>, з кім ты знаёмы, і я скажу, хто ты* ← ісп. *Dime con quién andas y te diré quién eres* (С.М. дэ Сервантэс, "Дон Кіхот" (1605-1615); *<Добра> смяецца той, хто смяецца апошні (апошнім)* ← фр. *Rira bien qui rira le dernier* (Ж.К. дэ Фларыян, "Два селяніна і хмара" (1792) ці англ. *He laughs best that laughs last* (Дж. Ванбру, "Сельскі дом" (1703), першапачаткова французская народная прыказка.

3. Для характарыстыкі ў вобразнай форме сутнасці якой-небудзь з'явы, характара, сітуацыі, адносін, напр.: *паляванне на ведзьмаў* ← англ. *witch-hunt* (узнікненне выразу звязана з практыкай інквізіцыі – судова-паліцэйскай установы каталіцкай царквы для барацьбы з ерэтыкамі, вальнадумцамі, антыцаркоўным ці антыфеадальным рухам; створаная на пачатку XIII ст., яна праіснавала ў краінах Заходняй Еўропы да канца XVII ст. (у Вялікім княстве Літоўскім была ўведзена з 1436 г. і скасавана праз 43 гады); *ваяваць (змагацца) з ветракамі* або *бітва (змаганне) з ветракамі* ← ісп. *molinos de viento acometer* (С.М. дэ Сервантэс, "Дон Кіхот" (1605-1615); *шагрэневая скура* ← фр. *"La peau chagrin"* (назва рамана (1830-1831) французскага пісьменніка А. дэ Бальзака (1799-1850); *хросны бацька* ← англ. *"The Godfather"* (назва рамана (1969) амерыканскага пісьменніка М. П'юзо (1920-1999) і кінафільма (рэжысёр Ф. Копала, 1972-1990).

4. Для ажыўлення мовы і пераводу яе ў жартаўлівую танальнасць, напр.: *цень бацькі Гамлета* ← англ. *Ghost of Hamlet's Father* (У. Шэкспір, "Гамлет" (1601); *Уставайце граф, вас чакаюць вялікія справы!* ← фр. *Levez-vous, monsieur le comte, vous avez de grandes choses à faire!* (выслоўе слугі французскага гісторыка герцага Клода Анры дэ Сен-Сімона (1760-1825), якім ён штораніцы будзіў свайго гаспадара, пра што згадваецца ва

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўспамінах сучаснікаў вучонага); *Фігара тут, Фігара там* ← іт. *Figaro, Figaro. Son qua, son qua. Figaro, Figaro. Eccomi qua* (цытата з лібрэта італьянскага паэта Ч. Стэрбіні (1784-1831) да оперы "Сявільскі цырульнік" (1816) італьянскага кампазітара Дж. Расіні (1792-1868) паводле аднайменнай камедыі (1775) французскага драматурга П.А. Бамаршэ (1732-1799); *Спыніся імгненне! Ты цудоўнае!* ← ням. *Verweile doch! Du bist so schön!* (І.В. Гётэ, "Фауст" (1808); *Фініта ля камедыя!* ← іт. *Finita la commedia!* (заключная фраза п'ес, якія ставіліся ў італьянскім тэатры).

Нярэдка характарызуючыя крылатыя словы выкарыстоўваюцца ў іранічным сэнсе, напр.: *Так мінае (праходзіць) зямная слава (Сік транзіт глорыя мундзі)* ← лац. *Sic transit gloria mundi* (выслоўе з афіцыйнага рытуалу абрання папы рымскага); *Шлях у пекла высланы добрымі намерамі* ← англ. *Hell is full of good meanings and wishings* (В. Скот, "Ламермурская нявеста" (1819) ці англ. *Hell is paved with good intentions* (выслоўе англійскага пісьменніка С. Джонсана (1709-1784), які ў 1775 г. згадаў, што аўтарам гэтага афарызма з'яўляецца англійскі багаслоў Джорж Герберт (?-1632); *<Усё> новае – гэта даўно (добра) забытае старое* ← фр. *Il n'y a de nouveau que ce qui est oublié* (афарызм з "Мемуараў Розы Бертэн" (1824); падробленых успамінаў мадыстки французскай каралевы Марыі-Антуанеты (1755-1793), які быў выказаны ў адносінах да падноўленага старога плашча каралевы); *Рэлігія – опіум <для> народа* ← ням. *Religion ist Opium für das Volk* (К. Маркс, "Да крытыкі гегелеўскай філасофіі права" (1844); *Багатыя таксама плачуць* ← ісп. *"Los rigos tambien lloran"* (назва мексіканскага тэлевізійнага серыяла (1979), вельмі папулярнага ў Беларусі ў 1990-я гг.) і г.д.

Літаратура

1. Крылатыя выразы ў беларускай мове. Ч. 1: З іншамоўных (еўрапейскіх і амерыканскіх) крыніц XII – XX стст.: тлумачальны слоўнік / Пад рэд. Я.Я. Іванова. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – 136 с.

2. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск: БелЭн, 2004. – 448 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова